УДК 94(476)“15–16”:347.6:930

# Перадшлюбная дамова як крыніца па сямейна-шлюбных дачыненнях шляхты ВКЛ XVI–XVII стст.

**Сліж Н.У.**
***“БІП – Інстытут правазнаўства”, Гродзенскі філіял, Гродна***

*Артыкул прысвечаны перадшлюбнай дамове, якая заключалася ў шляхецкім асяроддзі ВКЛ, умовам складання дакумента і яго выканання. З яе пачыналася дакументальнае афармленне шлюбу. Пазней складаліся вяноўны запіс, рэестр пасагавых рэчаў, квіт пра атрыманне пасагу. У дакументах агаворваліся вена, пасаг, дата і месца вяселля, веравызнанне сужэнцаў і іх дзяцей, зарука пры невыкананні дамовы. Але прадстаўленыя перадшлюбныя кантракты паказваюць, што агульнага фармуляру дакументу не было. І не ўсе ўзгаданыя пункты кантракту маглі прысутнічаць. Перадшлюбная дамова мела прававую моц. Для яе скасавання без прававых наступстваў неабходна была воля абодвух бакоў. Калі гэта здзяйснялася наўмысна, без папярэджання, то гэта з'яўлялася правапарушэннем. Пасля заключэння перадшлюбнай дамовы пачыналася падрыхтоўка да вяселля.*
***Ключавыя словы:*** *перадшлюбная дамова, сямейна-шлюбныя дачыненні, шлюб, шляхта.*

*(Ученые записки. – 2012. – Том 13. – С. 17–25)*

# The marriage contract as a source of family and marriage relations of gentry of GDL in the XVI–XVII centuries

**Slizh N.U.**
***BIL Institute of Law, Grodna Branch, Grodna***

*The article is devoted to the marriage contract, which was signed between representatives of noble society of the GDL, its conditions and implementation. It started documentary drawing up the marriage. After that a dower list, a register of dowry, and a list about receiving a dowry were drawn up. The document stipulated for a dow er, a dowry, a date and a place of wedding, religion of the wife, the husband and their children, a fine (in the case of abrogating the contract). However, all presented in the article contracts illustrate that there was no certain model for making up this type of document. Not all mentioned points were in contracts. The marriage contract was a legal document. Agreement of the two sides was necessary for annulling the contact. An intentional canceling the contract was considered as an infringing activity. Preparation for the wedding began after signing the marriage contract.*
***Key words:*** *marriage contract, family and marriage relations, marriage, gentry.*

*(Scientific notes. – 2012. – Vol. 13. – P. 17–25)*

Перадшлюбная дамова (змоўны, заручальны ліст) адносіцца да асобнай групы прыватна-прававых крыніц. Яна не была прадметам даследавання айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Шлюбныя дачыненні шляхты ВКЛ мелі кантрактны характар. У іх важную ролю адыгрывала перадшлюбная дамова, у якой агаворваліся ўмовы шлюбу. З яе па сутнасці і пачыналася дакументальнае афармленне шлюбу.

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* magistra-v@mail.ru – **Н.У. Сліж**

Пазней складаліся вяноўны запіс, рэестр пасагавых рэчаў, квіт пра атрыманне пасагу.

Мэта працы – даследаванне перадшлюбнай дамовы як крыніцы па сямейна-шлюбных дачыненнях, прадстаўленне яе зместу, умоў выканання.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праведзена на падставе 14 перадшлюбных дамоў за XVI–XVII стст., якія мелі месца ў шляхецкім асяроддзі. З іх надрукаваных 6, а ненадрукаваных – 8. Апошнія захоўваюцца ў калекцыях у Беларусі, Літве, Польшчы. Згаданыя дакументы сталі асновай для правядзення крыніцазнаўчага аналізу. Былі прааналізаваны пункты перадшлюбнай дамовы (вена, пасаг, дата і месца вяселля, веравызнанне сужэнцаў і іх дзяцей, зарука пры невыкананні дамовы).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Шлюб для шляхецкага грамадства быў важнейшым інстытутам. Ён рэгуляваўся заканадаўствам, кананічным правам, традыцыямі і звычаямі. Шлюб выконваў шэраг функцый для грамадства, сям'і і асобы: легітымізацыя новай сям'і перад асяроддзем пры ўмове, што заключаны ў адпаведнасці з прынятымі нормамі; захаванне, перадача, трансляцыя шлюбных традыцый, звычаяў і абрадаў; выхаванне асобы праз прамовы і павучэнні аб манагамным шлюбе; усталяванне і захаванне ўзораў паводзінаў для мужчыны і жанчыны ў шлюбе; спрыянне да набліжэння да ідэальнага вобразу мужчыны і жанчыны; прадстаўленне, знаёмства, камунікацыя сем'яў і родаў; пашырэнне сферы ўплыву для сям'і і роду. Хоць шлюб, у першую чаргу, меў дачыненне прыватна да мужчыны і жанчыны, але тут іх асабістыя адносіны набывалі сацыяльны характар.

Для шляхты шлюб быў сродкам вырашэння разнастайных праблем: эканамічных, сацыяльных, рэлігійных, біялагічных і інш. Таму да выбару сужэнца падыходзілі сур'ёзна. Прыняцце рашэння пра шлюб мела калегіяльны характар, дзе сям'я, род, асяроддзе адыгрывалі важную ролю.

Для шлюбу жаніх і нявеста павінны былі мець адпаведны ўзрост. Але звычаёвае права дапускала заручыны непаўналетніх. Такія выпадкі мелі месца прыкладна да канца XVI ст. Дворны канюшы Марцін Багданавіч Храптовіч заручыў свайго сына з малой дачкой С. Алізаровіча з дазволу яго ўдавы (1506). Вялікі князь літоўскі Аляксандр перадаў яму апеку над дзяўчынай. Пазней, калі ўдава падала скаргу на М. Храптовіча, то Жыгімонт Стары пацвердзіў папярэдняе рашэнне [1, с. 5–6]. Валынскі ваявода Богуш Карэцкі і віленскі кашталян Ян Хадкевіч заручылі сваіх непаўналетніх дзяцей Якіма і Ганну, а тэрмін вяселля прызначылі праз 6 год, якое пасля і адбылося. У змоўным ліце Б. Карэцкі абяцаў, што яго сын вылучыць вена за пасаг у памеры 4 000 коп літоўскіх грошаў і 2 000 у рухомых рэчах (1576) [1, с. 290–294].

Папярэднія дамовы паміж бацькамі (сваякамі, сябрамі) жаніха і нявесты маглі адбывацца ў вуснай ці пісьмовай форме. Аб іх наяўнасці сведчаць тэстаменты, у якіх згадваюцца ўжо абраныя сужэнцы для дзяцей. Так, шляхціц Ваўкавыскага павету Андрэй Фёдаравіч Адамовіч абраў для дачок наступных мужоў: Кацярыне – Францыска Снарскага, Марысі – Марціна Пацкевіча, Еве – Андрэя Яцкевіча (1651) [2, ф. 1664, воп. 1, спр. 310, арк. 4]. Яшчэ да дасягнення шлюбнага ўзросту дачкі Ганны Ян Дамаслаўскі дамовіўся пра яе шлюб з Паўлам Звяртоўскім і прасіў жонку выканаць яго распараджэнне (1675). Яго воля была выканана [2, ф. 1663, воп. 1, спр. 661, 662]. Падобная ўскосная інфармацыя часцей адлюстроўвалася ў дакументах XVII ст. Вусная перадшлюбная дамова таксама мела месца і ў XVI ст., асабліва сярод сярэдняй і дробнай шляхты.

Калі дасягалася папярэдняя згода паміж бацькамі, то прыходзіў час на змовіны ці заручыны. Яны афармляліся дакументальна як шлюбны кантракт і

актыкаваліся ў гродскім ці земскім судах. Звычайна ў дамове галоўнымі дзеячамі выступалі не тыя, хто ўступалі у шлюб, а асобы, якія адказвалі за іх. Гэта маглі быць бацькі, апекуны, браты ці іншыя сваякі, нават сябры.

У фіксаванні кантракту ў пісьмовай форме былі больш зацікаўлены найбольш заможныя прадстаўнікі шляхецтва, калі гаворка ішла пра вялікія сумы пасагу і вена. Але пры гэтым мы не можам адзначыць, што складанне перадшлюбнай дамовы мела масавы характар. Дакументы не падлягалі абавязковай актыкацыі, не былі нармаваны заканадаўствам ВКЛ. Таму яны рэдка сустракаюцца ў судовых кнігах, у большасці паходзяць з сямейных архіваў. Ніжэй прыведзены шэраг шлюбных дамоваў, якія адносяцца да розных гадоў XVI–XVII стст.

Гетман ВКЛ Канстанцін Іванавіч Астрожскі заключыў дамову з троцкім ваяводам Юрыем Мікалаевічам Радзівілам і яго жонкай Барбарай аб шлюбе іх дачкі Ганны з яго сынам Іллёй. У дакуменце агаворвалася пытанне веравызнання: Ілля заставаўся праваслаўным, а Ганна – каталічкай, але дзеці незалежна ад полу хрысціліся па праваслаўным абрадзе пад зарукаю[1] 10 000 коп гаспадару і 10 000 – К. Астрожскаму (13 чэрвеня 1524 г.) [5, dz. V, sygn. 18, k. 5–6]. Пазней гэтыя заручыны былі скасаваны, і І. Астрожскі ажаніўся з Беатай Касцельскай [11, s. 24–25].

У судовай справе з-за нявыдачы пасагу Цімафею Сакалінскаму ад братоў яго жонкі Аўдоцці Івана, Багдана, Міска і Яска Іванавічаў Баратынскіх прыведзены ліст іх бацькі Івана Баратынскага, дзе ён абяцае даць у якасці пасагу дварэц у Маішаголе (Віленскае ваяводства), 50 коп літоўскіх грошаў, 13 чалавек нявольнай чэлядзі і рухомыя рэчы (перлавыя брамкі, футра, плашч, сярэбраныя лыжкі і інш.). Дакумент быў замацаваны пячаткамі двух сведак – гаспадарскім дваранінам Іванам Сялявай і пісарам троцкага ваяводы Фёдарам Уладыкам (1542) [8, p. 47–49]. Гэты ліст можна разглядаць як частку перадшлюбнай дамовы з боку нявесты, у якой дзеючымі асобамі выступаюць бацька і жаніх, а яе прадметам з’яўляецца пасаг.

У змоўным лісце Глеб Янавіч Сапега (гл. дадатак) абавязаўся ажаніцца з дачкой віленскага цівуна і гараднічага Шымка Мацкавіча – Кацярынай (1538). У сваю чаргу бацька нявесты прызначыў пасаг 300 коп літоўскіх грошаў (200 – у грошах і 100 – у рухомых рэчах). Акрамя таго, ён быў абавязаны даць частку мацярыстага маёнтка ў Жамойці. У змовінах Глеб выступае самастойна, толькі адзначае, што сватаецца з Божай волі і парады сяброў, іх імёны не называюцца. Ад імя нявесты выступае бацька. Але адзначана акалічнасць на выпадак яго смерці: дамова застаецца ў моцы і яе павінны выканаць сыны. У дакуменце адсутнічаюць запіс вена, дата і месца правядзення вяселля [5, dz. X, sygn. 49].

Пётр Багданавіч Загароўскі сам дамаўляўся з маці нявесты, удавой валынскага маршалка Фёдара Андрэевіча Сангушкавіча, – Ганнай Дэспатаўнай і яе братам Дзмітрыем Фёдаравічам Сангушка-вічам аб шлюбе з Фядорай (1549). Сума пасагу не ўзгадвалася, адзначана, што яна акрэслена ў тэстаменце бацькі Фядоры. Вяселле прызначалася на Раство ў замку Несухоежскім. Прызначалася зарука ў памеры 1 000 коп літоўскіх грошаў, калі П. Загароўскі не прыедзе на вяселле і не ажэніцца з Фядорай [6, s. 2–3]. У дадзеным дакуменце агаворваецца пасаг, дата і месца шлюбу, але не вызначана вена.

У Метрыку ВКЛ было занатавана вуснае сведчанне Беаты Касцельскай аб змовінах яе дачкі Гальшкі з Лукашам Гуркам. У ім маці абавязалася не выдаваць яе замуж за іншую асобу пад зарукай 100 000 коп літоўскіх грошаў. Пры гэтым у дзяўчыны афіцыйна запыталі пра

[1] Зарука – грашовае спагнанне, якое прызначалася за парушэнне любога віду дамовы.

згоду на гэты шлюб. Аднак агаворвалася, што Гальшку пазбавяць спадчыны, і маёмасць пяройдзе да вялікага князя літоўскага і караля ў выпадку яе самавольнага шлюбу з іншай асобай (1555) [9, p. 21–22].

Дасягнулі згоды аб шлюбе жытомірскага старосты Рамана Сангушкі (кл. 1537–1571) і Аляксандры Хадкевічаўны ў 1558 г. віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565) і віцебскі ваявода Грыгорый Аляксандравіч Хадкевіч (?–1572). Вяселле планавалася на 1559 г. у маёнтку на Падляшшы. За Аляксандрай бацька прызначыў 2 000 коп літоўскіх грошаў і 2 000 у золаце і рухомых рэчах. Раман Сангушка абавязаны быў запісаць вена жонцы. Г. Хадкевіч напісаў ліст, дзе абавязаўся даць пасаг і справіць вяселле пад зарукай 6 000 коп літоўскіх грошаў каралю і 6 000 – Р. Сангушцы. Вена было запісана ў памеры 4 000 (1559) [7, s. 32–35, 53].

Шлюб Януша Кузьміча Заслаўскага ладзілі яго сябры Іван Фёдаравіч Чартарыйскі і Раман Фёдаравіч Сангушка (1561). За другой дачкой Зафеяй Грыгорый Аляксандравіч Хадкевіч даў пасаг у памеры 2 000 коп літоўскіх грошаў і 2 000 у рухомых рэчах. Вяселле павінна было адбыцца ў 1562 г., а жаніх абавязаны быў запісаць вена. У выпадку скасавання заручынаў прызначалася 4 000 коп літоўскіх грошаў бацьку нявесты і 4 000 – каралю [7, s. 64–65]. Дадзеныя дамовы складзены даволі падобна, бо тычыліся сясцёр. У іх прысутнічаюць усе неабходныя элементы: пасаг, абавязак запісаць вена, дата вяселля, зарука.

Васіль Пятровіч Загароўскі даў адмысловы ліст, дзе адзначалася пра яго дамову з Мікалаем Андрэевічам Збаражскім, крэмянецкім старостам, пра шлюб з яго дачкой Марынай. Вяселле прызначалася на 1565 г. За пасаг В. Загароўскі абяцаў запісаць вена з прывенкам. Пры невыкананні ўмоваў зарука была ў памеры 1 000 коп літоўскіх грошаў (1564). Вяселле адбылося ў 1566 г. Марыне было запісана вена. Але праз год яны развяліся [1, с. 76–80, 147–168, 205–210].

Гарадзенскі земянін Станіслаў Былчыч засведчыў адмысловым лістом пра змовіны свайго сына Марціна і Дароты Лукашоўны, пляменніцы Яна Мікалаевіча, котрынскага і азерніцкага падстаросты. У ім адзначалася, што іх павянчалі, але верагодна гэта быў абрад заручынаў, які таксама праводзіцца ў царкве. Дамовіліся згуляць вяселле праз год, у 1568 г., на працягу двух тыдняў пасля Вялікадня. Калі сын не возьме яе ў жонкі, то прызначалася зарука вялікаму князю літоўскаму 200 коп літоўскіх грошаў, а Яну ці яго жонцы Ганне Міхайлаўне – 100 і кампенсацыя ўсіх накладаў. Пасля шлюбу абавязаўся запісаць вена на маёнтку Пыра ў памеры 240 коп (1567). Вяселле адбылося праз год і Марцін Былчыч за 240 коп прызначыў вена ў той жа суме (1568) [2, ф. 1755, воп. 1, спр. 6, арк. 5–9].

У заручальным лісце было адзначана, што Есіф Іванавіч Нямерыч і яго жонка змовілі сваю дачку Настассю за Лазара Лаўрэнц’евіча Іваніцкага (1565). Заручыны адбыліся свецкія і царкоўныя. Е. Нямерыч абавязаўся выдаць дачку замуж у сваім маёнтку Олеўскім, які знаходзіўся каля Гарадка[1], праз год, пасля Вялікадня, і даць пасаг у памеры 500 коп літоўскіх грошаў і 500 коп у рэчах. А жаніх павінен будзе за гэта запісаць вена, а пры невыкананні ўмоў – заплаціць 1 000 коп літоўскіх грошаў гаспадару і столькі ж Л. Іваніцкаму. Але вяселле не адбылося. Е. Нямерыч засведчыў у Мазыры, што дачка хворая. А калі жаніх прыехаў у прызначаны дзень – 26 мая 1566 г., то гаспадары з’ехалі разам з дачкой. Л. Іваніцкі падаў скаргу з патрабаваннем кампенсацыі за выдаткі на вяселле (1566) [1, с. 93–96]. У склад

[1] У дакуменце мясцовасць называецца Гарадок, але па ўскосных звестках можна меркаваць, што тут згаданы Гарадок Давыдаў.

скаргі ўваходзіла передшлюбная дамова. Дзякуючы гэтаму вядома, што на заручынах дамаўляліся пра дату і месца вяселля, пасаг, вена, прызначалася сума зарукі.

Януш Іванавіч Чартарыйскі (?–1581) абавязаўся ажаніцца з Евай Баркулабаўнай Корсакаўнай (25 жніўня 1577 г.). Пра шлюб дамаўляўся з яе маці, удавой дзісненскага старосты Баркулаба Корсака, княгіняй Паланеяй Васілеўнай Крошынскай у яе маёнтку Шупені (Аршанскі павет). Шлюб павінен быў адбыцца ў маёнтку Корсакаў 2 лютага 1578 г.[1] У "Баркулабаўскім летапісе" напісана, што вяселле было 2 студзеня на Грамніцы, якія адзначаюцца 2 лютага. Так што тут відавочна памылка летапісца [4, с. 174–192]. Жаніх павінен быў прыехаць у маёнтак у вызначаны час. Прычынамі, якія маглі выбачаць яго адсутнасць, былі вайсковая служба і хвароба. Ён быў абавязаны запісаць вена з прывенкам. Асобна адзначана, што шлюб адбудзецца па хрысціянскім звычаі, без удакладнення: па каталіцкім ці праваслаў-ным. У выпадку невыканання ўзятых на сябе абавязкаў (не прыехаў на вяселле, не запісаў вена ці не ажаніўся) выплачвалася зарука ў памеры 20 000 коп літоўскіх грошаў. Дакумент замацаваны подпісамі і пячаткамі сведак, сярод іх – пячатка і подпіс Я. Чартарыйскага [10, f. 16–45, l. 42–43]. Дадзены дакумент утрымлівае звесткі пра месца і дату вяселля, абавязак запісаць вена, але ў ім нічога не пішацца пра памеры вена і пасагу.

У пазыковым запісе Давыда Дзмітрыевіча Адзінцэвіча сваёй нявесце Дароце Углоўскай на суму 1 200 коп літоўскіх грошаў пад заставу маёнтка Скляпаве (Аршанскі павет) было ўзгадана пра шлюбную дамову (11 чэрвеня 1599 г.). Яна была заключана з бацькамі нявесты аршанскім земскім падсудкам (1585) Паўлам Іванавічам Углоўскім Парасуковым і яго жонкай Людмілай. Яны абмяняліся лістамі і прызначылі дату вяселля на 20 верасня 1599 г. [10, f. 16–59, l. 18–19].

У Вільні 1 мая 1614 г. адбыліся змовіны Яна Альбрэхта Радзівіла (1591–1626) з Лавініяй Карэцкай. Гетман ВКЛ Ян Караль Хадкевіч (1561–1621) выступаў пасярэднікам у гэтай справе. Інтарэсы нявесты прадстаўляла ўдава Яхіма Карэцкага – Ганна Хадкевічаўна[2] і яе сыны Самуэль і Караль. За Лавініяй даваўся пасаг 50 000 злотых і 20 000 у рухомых рэчах. Вяселле прызначалася на дзень Св. Варфаламея ў мястэчку Корцы. Для канчатковай дамовы на Валынь павінны былі выехаць ад Я. Радзівіла менскі падкаморы Енох Кавячынскі, ад Я. Хадкевіча – навагарадскі войскі Якуб Прошыцкі. Ліст быў замацаваны пячаткай і подпісам Я. Хадкевіча [2, ф. 694, воп. 1, спр. 199, арк. 31–31 адв.]. Вяселле адбылося 9 лістапада [12, s. 199].

У якасці змоўнага ліста маглі выступаць сведчанні вознага. Слонімскі возны Станіслаў Мрочка ў кнізе слонімскага гродскага суда зрабіў запіс аб змовінах (4 мая 1569 г.). Дваранін ЯКМ Багуматка прыехаў да князя Гаўрылы Казбулатавіча Пяцігорскага 1 мая, каб сасватаць за сябе яго дачку. Вяселле павінна было адбыцца ў Зукачэвічах у гэтым жа годзе. Адзначалася, што дачка выказала згоду на шлюб [2, ф. 1781, воп. 1, спр. 1, арк. 245 адв.]. Луцкі возны Андрэй Жыкрыцкі засведчыў заручыны Станіслава Кавезскага і Настассі Васілеўны Храбтовічаўны (1585) [1, с. 430–431]. Гэтыя запісы ў судовай кнізе цікавыя па сваім змесце. Яны не так часта сустракаюцца. У адрозненне ад передшлюбнай дамовы, дзе прадстаўлены два бакі, тут запіс ідзе ад імя вознага, у прысутнасці якога адбыліся змовіны. На іх былі агавораны прыкладная дата шлюбу, месца і

[1] Дакумент захаваўся ў пашкоджаным стане. Там, дзе павінна была быць напісана назва маёнтка, ліст парваны.

[2] Ганна была роднай сястрой Яна Караля Хадкевіча.

выказана згода дзяўчыны. Аб заруцы нічога не адзначана.

Аднак наяўнасць перадшлюбнай дамовы не азначала, што пытанне шлюбу вырашана канчаткова і адбудзецца вяселле. Яе дзеянне маглі спыніць афіцыйна, што дазваляла мірным шляхам вырашыць справу і пазбегнуць судовага пераследу. Прывілей Жыгімонта Старога ад 20 кастрычніка 1536 г. скасаваў папярэднія змовіны і пацвердзіў новыя на шлюб паміж дзецьмі віленскага ваяводы Альбрэхта Марцінавіча Гаштольда і гетмана ВКЛ Юрыя Мікалаевіча Радзівіла – Станіславам Гаштольдам і Барбарай Радзівілаўнай адпаведна. Спачатку было дамоўлена аб шлюбе старэйшай дачкі Ганны са Станіславам. Але атрымалася так, што яна была змоўлена раней за Іллю Астрожскага. Папярэднія змоўныя лісты на шлюб Станіслава і Ганны былі прызнаны як несапраўдныя. У выніку Ганна павінна была выйсці замуж за Іллю Астрожскага, а Барбара – за Станіслава Гаштольда [5, dz. XI, sygn. 18, k. 27–28]. У дадзеным выпадку гаспадар скасаваў папярэднія змоўныя лісты і пацвердзіў новыя.

Яраслаў Фёдаравіч Сангушка дамовіўся з Андрэем Сангушкавічам Кашэрскім і яго жонкай Багданай Міхайлаўнай Мсціслаўскай пра шлюб з іх дачкой Ганнай у 1563 г. Але на той час А. Кашэрскі ўжо памёр і Я. Сангушка і Б. Мсціслаўская скасавалі згоду і вызвалілі адзін аднаго ад зарукі (10 верасня 1563 г.) [6, s. 228].

Перадшлюбная дамова прызнавалася неадпаведнай, калі яе заключалі асобы, якія не мелі на гэта паўнамоцтваў. Так было скасавана пагадненне паміж мельніцкім старостам Грыгорыем Валовічам і уладзімірскім падкаморыем Аляксандрам Сямашкам (1566). Паводле яго праз пяць год прызначалася вяселле Грыгорыя, сына Г. Валовіча, і Багданы Васілеўны Сямашкаўны, стрыечнай сястры А. Сямашкі. Пасля шлюбу апошні абавязаўся перадаць маёмасць сястры, якую на той час трымаў у апецы. Зарука прызначалася ў 1 000 коп літоўскіх грошаў гаспадару і 1 000 коп – Валовічу. Але на судзе выявілася, што А. Сямашка не меў права заручаць яе з Г. Валовічам, бо не быў апекуном. Маці Галена Карпаўна і апекуны планавалі выдаць дзяўчыну за Януша Чацвярцінскага. Багдана сама была супраць шлюбу з Валовічам, бо ні разу не бачыла будучага мужа. Багдана стала жонкай Я. Чацвярцінскага, але пасля яго смерці выйшла другі раз замуж за Г. Валовіча і за добрае да сябе стаўленне падаравала яму вена ад першага мужа (1571) [1, с. 123–133, 229–231].

У духоўным судзе разглядалася скарга Багдана Цімафеевіча Пузыні на ўдаву Мікалая Юрагі. Яна не выканала перадшлюбную дамову і не выдала замуж за яго сваю дачку Федзю. Працэс працягваўся некалькі год. Кіеўскі мітрапаліт Макарый прысудзіў шляхцянцы выплаціць Б. Пузыні 2 000 коп літоўскіх грошаў зарукі, а шляхціч вызваляўся ад перадшлюбнай дамовы (1536) [1, с. 8–11].

Шэраг выпадкаў быў зафіксаваны ў свецкіх судах у XVI–XVII стст. Шчасны Сіруцевіч падаў скаргу на Барбару Саламярэцкую за зрыў заручынаў, якія адбыліся паміж ім і яе дачкой Марынай Ратомскай. Барбара была выклікана ў суд да віленскага ваяводы ў 1552 г., але не з’явілася. А ў 1553 г. яе інтарэсы прадстаўляў Іван Солтанавіч, але справу адклалі на два тыдні [2, КМФ-18, спр. 243, арк. 98].

Шляхціч Кобрынскага павета Шчасны Сцяцкевіч Верашчака па просьбе свайго бацькі Рамана падаў скаргу ў луцкі гродскі суд на шляхціча Луцкага павета Багдана Іванавіча Дроздзенскага за невыкананне перадшлюбнай дамовы (1569). Апошні абавязаўся ажаніцца з яго сястрой Ганнай, якая аўдавела пасля смерці мужа Грыгорыя Пашкевіча Ельца. Б. Дроздзенскі апошні раз быў у доме Рамана пасля вяртання з гарадзенскага

сойму ў 1568 г. і больш не падаваў пра сябе звестак [1, с. 190–191].

У судовай скарзе Яна Станіслававіча Талочкі на жонку Багдана Годкінскага Аксінню Сіргуцеўну і на сыноў яе Андрэя, Юрыя, Гаўрыілу і Мікалая Багданавічаў Годкінскіх адзначалася, што яна змовіла за яго дачку Паланею праз "духовную і людей зацных". Пры гэтым атрымала ад яго падарункі і жыта. У выніку Паланею выдалі замуж за Юзафа Рымонда, жыта выкарыс-талі. Праз суд Я. Талочка патрабаваў кампенсацыі выдаткаў (1599) [2, ф. 1755, воп. 1, спр. 16, арк. 376 адв.–377 адв.].

Адам Жыжэмскі дамовіўся пра шлюб з Ядвігай, дачкой Яна Цымінскага і Гальшкі. Вяселле было прызначана на 31 студзеня 1616 г. Калі ён прыехаў да нявесты са сваімі сябрамі, то Ядвіга была ўжо замужам за іншым. Гэта стала прычынай для скаргі ва ўладзімірскі гродскі суд (1616) [1, с. 535–536].

Скасоўвалі перадшлюбную дамову па ўзаемным пагадненні і праз суд. Зрыў змовінаў з'яўляўся слушнай прычынай для звароту ў суд і патрабавання кампенсацыі.

**Заключэнне.** Вынікам заручынаў з'яўлялася перадшлюбная дамова. Гэта быў не адзін дакумент, а два, бо кожны бок пісаў свае абавязкі адносна другога боку. Але выявіць два лісты не заўсёды падаецца магчымым, часцей гэта толькі адзін ліст. Калі жаніх мог сам прадстаўляць свае інтарэсы, то нявеста ўвогуле не выступала ў такой ролі ў дакументах. Гэта было звязана з тым, што да шлюбу яна знаходзілася пад наглядам бацькоў або апекуноў і не магла самастойна заключыць шлюбны кантракт. У дакументах агаворваліся вена, пасаг, дата і месца вяселля, веравызнанне сужэнцаў і іх дзяцей, зарука пры невыкананні дамовы. Але прадстаўленыя дакументы паказваюць, што агульнага фармуляру дакументу не было. І не ўсе ўзгаданыя пункты маглі прысутнічаць.

Перадшлюбная дамова мела прававую моц. Для яе скасавання без прававых наступстваў неабходна была воля абодвух бакоў. Калі гэта здзяйснялася наўмысна, без папярэджання, то гэта з'яўлялася правапарушэннем. Так як падрыхтоўка да вяселля патрабавала матэрыяльных выдаткаў, то асноўным патрабаваннем з'яўлялася кампенсацыя выдаткаў і вяртанне падарункаў.

У ланцугу дакументаў перадшлюбная дамова была першым дакументам, з якога пачыналася прававое афармленне шлюбных дачыненняў. Наступныя дзеянні прадстаўнікоў жаніха і нявесты павінны былі адбывацца па пэўным сцэнары: вяселле ў вызначаныя дату і месца, адпаведныя памеры пасагу і вена.

**Дадатак. Перадшлюбная дамова Глеба Сапегі, 1538**

Дакумент захоўваецца ў Галоўным Архіве Старажытных Актаў (AR. X, sygn. 49). Ён напісаны на старабеларускай мове. Замацаваны 4 пячаткамі: пячатка Глеба Сапегі з выявай герба "Ліс" з лацінскімі літарамі ўверсе "H[leb]" "S[opega]", пячатка Паўла Сапегі з вы-явай герба "Ліс" з лацінскімі літарамі ўверсе "P[avel]" "S[opega]", пячатка Ба-гдана Дзмітрыевіча Агінскага з выявай уласнага герба (страла з перакладзінай пасярэдзіне на "П"-падобнай падставе) і пячатка Сямёна Канстанцінавіча Жабы з выявай герба "Кастеша".

Я Глебъ Яновичъ Сопега о*б*яваю тымъ листо*м* нине*ш*нимъ и не пото*м* будучимъ кому буде*т* потре*б* того ведати або чту*чи* его слыша*ти* што *ж* по Бо*ж*еи воли и по своеи до*б*рои мысли а порадою и з волею приятелеи мои*х* кро*в*ныхъ змови*л* есми с паномъ Шымкомъ Мацковичо*м* тивуно*м* и горо*д*ничомъ виле*н*скимъ де*р*жа*в*цею ушпо*л*скимъ и раду*н*скимъ до*ч*ку его м(ило)сти па*н*ну Катерину паняти и за вечыстую ма*л*же*н*ку мети. А па*н* Шы*м*ко мае*т* мне по до*ч*це своеи па*н*не Катерине посагу дати готовыми гро*ш*ми двесте копъ а у выправе сто копъ грошеи а к тому часть име*н*я в Жомоити которая на неи по ма*т*це ее пани Шы*м*ковой Зофеи приде*т* и тои умовы н(а)шеи ни которы-ми причинами не маю отступати и до*ч*ки

его м(ило)сти па*н*ны Катерины опустити. Если *ж* бы*х* тои умовы н(а)шеи и того листу свое*го* припомнилъ а до*ч*ки пана Шы*м*ковы па*н*ны Катерины понята не хотел тогды маю заплати*ти* г(о)*с*(по)д(а)рю королю его м(ило)сти тисячу ко*п* грошеи а па*н*у Шы*м*ку тисячу копъ грошеи и чого Б(о)же ухова*и* естли Богъ на пана Шы*м*ка допусти*л* смерть тогды я пре*д*еся ты*м* же обычае*м* зъ сы*н*ми его м(ило)сти тую умову маю де*р*жати и па*н*ну Катерины не маю отпустити. А сынове его м(ило)сти те*ж* то*т* поса*г* двесте ко*п* гроше*и* готовы*х* а выправы за сто ко*п* дати з ыменеи свои*х* о*т*чи*з*ны*х* и часть именя материстого в Жомойти мао*т* еи поступи*ти* той части што на не*и* при*и*де*т*. При то*м* были и то*го* добре зведали па*н* Паве*л* Иванови*ч* Сопега староста брасла*в*ски*и* ма*р*шалокъ г(о)*с*(по)д(а)ра короля его м(ило)сти[1] а кн(я)зь Богда*н* Дмитриеви*ч*[2] а па*н* Семе*н* Кастя*н*тинови*ч* Жаба хоружи*и* ке*р*новски*и*[3] и на то да*л* есми па*н*у Шы*м*ку Ма*ц*ковичу се*и* мо*и* листъ под моею печа*т*ю и те*ж* проси*л* есми тых выше*и* мененых пано*в* о печати и*х* ли*с*тъ на мою прозбу учини*ли* печа*ти* сво*и* къ сему листу прилажили. П(и)са*н* в Ви*л*ни м(есе)ца апре*л* 14 де*н* и*н*дикт 11 [1538].

## Літаратура


1. Архив Юго-западной России, издаваемый временною коммиссиею для разбора древних актов, высочайше учрежденною при Киевском Военном, Подольском и Волынском Генерал-губернаторе. – Киев, 1909. – Ч. 8, т. 3.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 694. – Воп. 1. – Спр. 199; Фонд 1755. – Воп. 1. – Спр. 6, 16; Фонд 1781. – Воп. 1. – Спр. 1; КМФ-18. – Спр. 243.
3. НГАБ у Гродне. – Фонд 1663. – Воп. 1. – Спр. 661, 662; Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 310.
4. Полное собрание русских летописей. – М., 1975. – Т. 32.
5. Archiwum Główny Aktów Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 18; Dz. X. – Sygn. 49; – Dz. XI. – Sygn. 18.
6. Archiwum XX. Sanguszków w Slawucie. – Lwów, 1910. – T. 6: 1549–1577.
7. Archiwum XX. Sanguszków w Slawucie. – Lwów, 1910. – T. 7: 1554–1572.
8. Lietuvos Metrika (1542). – 11-joi Teismų bylų knyga / Parengė I. Valikonitė, S. Viskantaitė. – Vilnius, 2001.
9. Lietuvos Metrika (1555–1558). – 37-oji Teismų bylų knyga / Parengė I. Valikonitė, L. Steponavičienė. – Vilnius, 2010.
10. Lietuvos mosklų akademijos Bibliotekas rankraščtų skyrius. – F. 16–45; f. 16–59.
11. Kempa, T. Konstanty Wasil Ostrogski (ok. 1524/1525–1608) Wojewoda Kijowski i marszałek ziemi Wołyńskiej / T. Kempa. – Toruń, 1997.
12. Pamiętniki Samuela i Bogusława Kazimierza Maskiewiczow (wiek XVII) / Oprac. A. Sajkowski. – Wrocław, 1961.


[1] Павел Іванавіч Сапега (?–1579), браслаўскі староста (1517), гаспадарскі маршалак (1519–1557), падляшскі ваявода (кл. 1559), навагарадскі ваявода (1558). Lulewicz, H. Sapieha Paweł // Polski Słownik Biograficzny. – T. 35/1. Zesz. 144. – Warszawa; Wrocław; Kraków, 1993. – S. 128–131.

[2] Багдан Дзмітрыевіч Агінскі быў жанаты з сястрой жонкі Ш. Мацкавіча Багумілай Паўлаўнай. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa, 1895. – S. 289. Таму ён мог тут прысутнічаць у якасці сведкі.

[3] Кернаўскі староста Сямён Канстанцінавіч Жаба часта фігураваў у судовых справах Метрыкі ВКЛ. У якасці суддзі не прысутнічаў Ш. Мацкавіч. Таму можна казаць пра іх знаёмства. Lietuvos Metrika (1528–1547), 6-oji Teismų knyga / Parengė S. Lazutka, I. Valikonitė. – Vilnius, 1995. – P. 31, 37, 45, 59.

*Паступіў у рэдакцыю 27.04.2012 г.*

*Прыняты ў друк 25.06.2012 г.*